тэматыкай твора: паказам жыцця людзей розных саслоўяў і грамадска–сацыяльных падзей;

5) найбольшая колькасць архаізмаў адносіцца да ўласна лексічных і лексіка–словаўтваральных;

6) ужыванне ўстарэлых слоў у рамане выклікана жаданнем аўтара наблізіць да сучаснага чытача асаблівасці жыцця нашых продкаў, падрабязна і дакладна апісаць пэўную гістарычную эпоху, г.зн. служыць для ўказання на час, у які адбываецца дзеянне.

Такім чынам, раман Ул. Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" дае багаты матэрыял для даследавання гістарычнай лексікі беларускай мовы.

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ АПТЭК

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Гурын А. А., студэнт 5 курса лячэбнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – Варанец В. І.

Першы ўспамін пра аптэку сустракаецца ў Гіпакрата (460-377 гг. н. э.) як пра месца для захоўвання лекавых сродкаў.

Першапачаткова народныя лекары самі рыхтавалі лекавыя сродкі з мясцовай сыравіны расліннага, жывёльнага і, радзей, мінеральнага паходжання. Першыя ж аптэкі як самастойныя ўстановы ў Беларусі ўпершыню згадваюцца ў крыніцах з сярэдзіны XVI ст. Іх з'яўленне звязана з актынаўнасцю ў эканамічным і культурным жыцці Беларусі. У XVI – першай палове XVII стст. ва ўмовах развіцця гарадскіх рамёстваў атрымлівае развіццё і аптэкарская справа. У рукапісах XVI ст. згадваецца пра існаванні некалькіх прыватных аптэк. Так, ў 1561 г. была адкрыта аптэка ў Пінску, а ў 1566 г. у Брэсце. Згадваецца аптэкар Станіслаў з Брэста, які атрымаў дазвол на адкрыццё ў мясцовым замку аптэкарскага склада. Вядома таксама, што ўладальнікам другой аптэкі ў Брэсце, адкрытай ў 1577 г., быў Сымон Душынскі. Яшчэ адна аптэка, адкрытая ў Брэсце, датуецца 1583 годам. Яе ўладальнікам да 1639 года быў Станіслаў Баброўскі. Акрамя таго, у дакументах XVI ст. згадваецца аб дзейнасці аптэкара Станіслава ў Пінску (1561 г.), а ў 1583 г. атрымаў дазвол на адкрыццё аптэкі цырульнік Генрых Нэльсан. У сярэдзіне XVII ст. адчыняецца першая аптэка і ў Мінску. Яе гаспадаром быў аптэкар Крыштаф Рабец. Аднак неўзабаве яна была зачынена і да XVIII стагоддзя пра яе забыліся. Наступная спроба стварэння аптэкі прадпрымаецца тут толькі праз стагоддзе. 28 лістапада 1748 г. члену мінскага магістрата, аптэкару Яну Давіду Шэйбу каралём Рэчы Паспалітай Аўгустам III быў выдадзены прывілей на адкрыццё ў Мінску аптэкі. Адкрыццё аптэкі звязана з правядзеннем у Мінску чарговых пасяджэнняў Галоўнага трыбунала ВКЛ, на якія прыязджаў кароль і збіраліся дэпутаты з усяго княства. У выпадку захворвання каго-небудзь з важных дзяржаўных асоб неабходна была наяўнасць у горадзе разнастайных лекаў. Наступны дазвол на адкрыццё



Репозиторий ГрГМУ

аптэкі ў Мінску быў выдадзены толькі праз 34 гады і адбылося гэта ў адпаведнасці з граматай караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, выдадзенай 1 кастрычніка 1782 г. Андрэю Станкевічу. У 1774 г. каралём выдадзены «прывілей» Навагрудскай аптэцы з правам грамадскай гарадской аптэкі. Валодаў аптэкай лекар Ф.Т. Эме, які адначасова з'яўляўся прыдворным лекарам магнатаў Радзівілаў у Нясвіжы.

Аптэкі маглі належаць не толькі прыватным асобам, але ствараліся таксама пры каталіцкіх кляштарах і езуіцкіх калегіюмах. У XVII ст. дзейнічала аптэка пры кляштары кармэлітак ў Глыбокім (1639 г.) У 1693 г. Лютэранскаму касцёлу ў Слуцку была перададзена ў валоданне аптэка, заснаваная 29 студзеня 1648 г. Маціяшам Валяр'янам Петынгерам і Крыштофам Вінклерам.

Ёсць звесткі пра існаванне аптэкі пры езуіцкім калегіуме ў Гродна (1687 г.), у 1706 г. пры калегіуме езуітаў у Пінску, якая абслугоўвала горад і яго наваколлі. У Нясвіжы ў 1740-х гадах таксама існавала аптэка пры езуіцкім калегіуме. Аптэкі існавалі пры кляштары картэзіянцаў у Бярозе (1740 г.), пры ўніяцкім манастыры ў Полацку (1765 г.). У 1773 годзе пры піярскім кляштары ксяндзом Л. Бреннетам была адкрыта аптэка ў Шчучыне. Усяго у XVI-XVII стст. на нашых землях дзейнічала не менш за сорак аптэк.

Па меры пашырэння медыцынскіх і фармацэўтычных ведаў, развіцця эканамічных адносін, адбываецца падзел працы аптэкара і лекара.

Лекі сталі выгадным таварам, а ўтрыманне аптэк - прыбытковай галіной гандлю. Фактычна сярэднявечная аптэка ўяўляла сабой шматпрофільную лаўку, у якой прадавалі самыя розныя тавары: гатовыя лекі (пілюлі, парашкі, сіропы, мазі і інш.), гаючыя травы, мінералы, вострыя прыправы, падрыхтоўвалі парфумерныя, кондицерскія і алкагольныя вырабы. Многія тавары, у тым ліку і лекі, былі імпартнай вытворчасці. Пры вырабе лекаў аптэкары карысталісявыкарыстоуваліся рукапіснымі зборнікамі рэцэптаў. Ад сваёй дзейнасці аптэкары мелі добры прыбытак, так як лекі каштавалі дорага і на лячэнне хвароб сыходзілі вялікія грошы. У дакументах канца XVIII ст. згадваюцца олейкары – вандроўныя гандляры лекамі, паслугамі якіх карысталася большасць насельніцтва з прычыны дарагоўлі лекаў і аддаленасці аптэк. У дамах багатых шляхціцаў меліся хатнія аптэчкі, у якіх захоўваліся розныя салодкія і настоеныя на травах гарэлкі, канфіцюры, марынады.

Пасля падзелу Рэчы Паспалітай (1772-1795 гг.) значная частка беларускіх земляў увайшла ў склад Расійскай імперыі. Адкрыццё аптэк і іх дзейнасць стала рэгуляваццa расійскім заканадаўствам. У другім Аптэкарскім Статуце, прынятым Сенатам 23 снежня 1836 г., восем параграфаў прысвечаны установе і перадачы вольных (прыватных) аптэк. Вольныя аптэкі ўстанаўліваліся з дазволу медыцынскага дэпартамента Міністэрства ўнутраных спраў. Аптэкі можна было адчыняць ў сталіцах, ва ўсіх гарадах і месцах Расіі усім, хто пажадае, у якасці заснавальніка або гаспадара ці кіраўніка. Пры гэтым існавалі патрабаванні да ўзроўню ведаў у галіне фармацыі да ўпраўляючага аптэкай. Кіраўнік аптэкай павінен быў мець званне аптэкара (самая вышэйшая фармацэўтычная ступень) ці правізара (вышэйшая фармацэўтычная ступень) і быць не маладзей 25 гадоў. Жадаючы заснаваць аптэку абавязаны быў падаць

Рэпазіторый ГрДМУ

прашэнне ў губернскую медычную ўправу (пазней медычнае аддзяленне) з дадаткам пасведчання аб фармацэўтычным званні.

У працэсе дзейнасці аптэк і адкрыцця новых ўзнікала шмат пытанняў. У сувязі з гэтым з'явілася патрэба выдання асобнага дакумента аб адкрыцці аптэк. 25 мая 1873 года былі зацверджаны правілы адкрыцця аптэк, у якія ўвайшлі разрозненыя раней патрабаванні. Большасць з правілаў 1873 года дзейнічалі да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Па меры неабходнасці ў іх уносіліся змены і дапаўненні.

## МІЖПРАДМЕТНЫЯ СУВЯЗІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
Заяц Я. В., студэнтка 4 курса педагагічнага факультэта
Кафедра прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання
Навуковы кіраўнік – к. філал. н., дацэнт Лапкоўская А. М.

Дыдактычная праблема, над якой працуюць усе настаўнікі – удасканаленне ўрока на аснове ўкаранення такіх форм навучання, якія, з аднаго боку, спрыяюць ўсвядомленаму і трываламу засваенню праграмнага матэрыялу, а з другога – развіваюць творчую актыўнасць вучняў, іх кемлівасць, дапытлівасць і фарміруюць пэўны светапогляд. Каб вырашыць гэту праблему, на наш погляд, найбольш падыходзяць камбінаваныя і інтэграваныя ўрокі. Прадмет «Літаратурнае чытанне» – адзін з вядучых прадметаў гуманітарнага цыклу агульнаадукацыйнай школы, які звязаны з цэлым шэрагам іншых навучальных дысцыплін. Працэс выкладання такога прадмета звязаны з выкарыстаннем вялікага аб’ёму інфармацыйнага матэрыялу, што стварае шмат цяжкасцей пры адборы, структураванні розных крыніц. І таму задача настаўніка – выявіць агульначалавечыя каштоўнасці, спрыяць аб’яднанню цэласнага светаўспрымання вучнямі.

Пытанні міжпрадметных сувязей асобных школьных вучэбных прадметаў знайшлі адлюстраванне ў педагагічных тэорыях шэрагу вядомых рускіх педагогаў (У.Ф. Адоеўскі, В.Г. Бялінскі, Н.Г. Чэрнышэўскі, К.Д. Ушынскі, У.Я. Стаюнін, Г.Ф. Федарэц і інш.). Так, Г.Ф. Федарэц азначае міжпрадметныя сувязі як педагагічную катэгорыю «для абазначэння інтэгратыўных адносін, якія сінтэзуюцца паміж аб'ектамі, з'явамі і працэсамі рэальнай рэчаіснасці, якія знайшлі сваё адлюстраванне ў змесце, формах і метадах вучэбна-выхаваўчага працэсу і якія выконваюць адукацыйную, развівальную і выхаваўчую функцыі ў іх арганічным адзінстве» [1, с. 74]. Джон Лок адзначаў, што міжпрадметныя сувязі падчас атрымання вучнямі новых ведаў адыгрываюць важную ролю для разумення ў шырокім плане з’яў рэчаіснасці, і іх сутнасці. Асабліва вялікі ўклад у распрацоўку гэтай праблемы зрабіў вядомы швейцарскі вучоны І. Г. Песталоцы, тэарэтычна абгрунтаваўшы і практычна даказаўшы

Репозиторий ГрГМУ